**Заданні для правядзення ўступных іспытаў па беларускай мове**

**А1** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару *а*:
1) р_гістратура; 2) лат_рэйны; 3) ільн_саломка; 4) д_мабудаўнічы;
5) выс_касортны.
**А2** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару *я*:
1) абм_ркаваць; 2) б_нзін; 3) аграбі_лагічны; 4) верац_но; 5) в_снушкаваты.
**А3** Адзначце прыклады з правільным напісаннем літары *ў*:
1) быў ў тых краях; 2) ва урочышчы; 3) выйдзеш уночы; 4) для Уругвая;
5) да часці, ў якой служыў.
**А4** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць апостраф.
1) він_етачны; 2) аб_яўленне; 3) л_е; 4) падвор_е; 5) Салаў_ёў.
**А5** Адзначце правільна напісаныя словы:
1) судзя; 2) сталасццю; 3) расеяць; 4) сабраны; 5) саракагоддзе.
**А6** Адзначце правільна напісаныя словы:
1) блізкі; 2) бяшчуласць; 3) выпрахчы; 4) іракскі; 5) кулямёччык.
**А7** Адзначце рады аднакаранёвых (роднасных) слоў:
1) каманда, камандзір, па камандзе;
2) бераг, беражок, берагчы;
3) зялёны, зеляніна, зелень;
4) вада, водны, вадзіць;
5) цэгла, цагляны, цагельня.
**А8** Адзначце словы, якія трэба пісаць разам:
1) (Валга) град; 2) (жалеза) бетон; 3) (бія) фізік; 4) (журналіст) міжнароднік;
5) (паў) Ліды.
**А9** Адзначце словазлучэнні з якаснымі прыметнікамі:
1) сіняя вада; 2) ісці шпарка; 3) асфальціраваная дарога; 4) вераб'іная ноч;
5) падзяка бацьку.
**А10** Адзначце словы, якія трэба пісаць праз злучок:
1) (каменна) шчэбневы; 2) (карычнева) чорны; 3) (маятніка) падобны;
4) (рыжа) хвосты; 5) (яхт) клубаўскі.
**А11** Адзначце сказы, у якіх ёсць дзеясловы загаднага ладу:
1) Аднойчы раніцай ціхае надвор'е змянілася ветрам.
2) Давайце ўспомнім дні дзіцячых прыгод, і казак, і надзей.
3) Воддаль ад падасінавікаў знайшоў пяць падбярозавікаў.
4) Хай жыве наш родны край.
5) Сады садзі і ў маладосці, і ў старасці.
**А12** Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга ці будучага простага часу маюць канчатак -еш (-эш):
1) адысці; 2) асушыць; 3) вырасціць; 4) дастаць; 5) засыпаць.
**А13** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць разам:
1) Жанчына стаяла і пазірала (у) *след*.

2) *(На) памяць* прыходзяць радкі з верша Максіма Багдановіча.
3) Праўда ходзіць *(на) цянькі,* з ёй не размінешся.
4) У вёсцы *(дзе) нідзе* мільгаюць агеньчыкі.
5) Хмызняк падступае да дарогі *(у) шчыльную.*
**А14** Адзначце сказы, у якіх усе выдзеленыя словы з не (ня), ні напісаны правільна:
1) Вялікі камень *не зрушыш* з месца.
2) На бярозе *ніводнага* лісціка, толькі голле ва ўсе бакі тырчыць.
3) Напачатку загадчыца *не вельмі* верыла ў маю замілаванасць да кнігі.
4) *Не справядлівасць* была выпраўлена.
5) *Нядужыцца* Валодзю сёння, таму *не пакоіць* яго не хачу.
**А15** Адзначце сказы, у якіх на месцы ўсіх пропускаў ужываецца ***не:***
1) Якое б _ трапіла гора, а ты ўсміхайся часцей.
2) Гара з гарою _ сходзяцца.
3) Горды ды ўпарты – _куды _ варты.
4) Доўгае тонкае голле звісае ледзь _ да зямлі.
5) Тады я _ ведаў яшчэ _ цёткі Мілі, _ Цімохі, _ самога Жыцькава, а таму _ мог _ запярэчыць, _ дагадзіцца.
**А16** Адзначце іменныя словазлучэнні:
1) абрысы гор; 2) арганізаваць хор; 3) ахутаны туманам; 4) варты ўвагі;
5) другі ад краю.
**А17** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы – дзейнікі:
1) Пад пагоркам бялела высокая фігура *воіна-вызваліцеля.*
2) Вецер мацнеў і са злосцю круціў вадзяныя *струмені.*
3) *Але* – супрацiўны злучнік.
4) *Усё* прыгажэе, квітнее наўкола.
5) Я спыніўся ля хаты старога *Арцёма.*
**А18** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў абавязкова ставіцца працяжнік:
1) Запаведнік _ пашукаць трэба.
2) Адданасць іх мужчынская і вера _ лепшы дар з усіх зямных дароў.
3) Спажыўныя, нават лячэбныя ягады _ журавіны.
4) Тураў _ маладзейшы за Полацк.
5) Яблыні _ як нявесты.
**А19** Адзначце безасабовы сказ.
1) Люблю шырокія рэкі.
2) Не чын паважаюць, а чалавека па яго праўдзе.
3) Песня чароўнай Сольвейг.
4) З вёскі сюды не залятала ніводнага гуку.
5) У нашым свеце так цалуюць рукі толькі маці.
**А20** Адзначце правільныя сцверджанні:
1) Дзейнік не можа быць выражаны прыслоўем.
2) У няпоўных сказах могуць быць прапушчаны галоўныя і даданыя члены сказа.
3) Складаназалежны сказ мае суадносныя часткі – галоўную і даданыя.
4) Афіцыйна-дзелавы стыль уласцівы розным канцылярскім дакументам, законам, пастановам, пратаколам, дыпламатычным актам.
5) Ад складаных якасных прыметнікаў можна ўтварыць толькі складаныя формы вышэйшай і найвышэйшай ступеняў параўнання.

**Заданні для правядзення ўступных іспытаў па беларускай мове**

**А1** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару *а:*
1) в _ льналюбівы; 2) пр_цігрыпозны; 3) кар_спандэнцыя; 4) п_ўстагоддзя; 5) т_рфакрошка.
**А2** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару *е:*
1) с_анс; 2) сем_нар; 3) цв_рдалобы; 4) с_мігадовы; 5) н_з.менны.
**А3** Адзначце прыклады з правільным напісаннем літары *у*.
1) ад паўднёвага захаду да усходу; 2) ва Усходняй і Цэнтральнай Еўропе;
3) ляглі ўпоперак; 4) таямніча-урачысты; 5) хадзіў ў школу.
**А4** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару *ь:*
1) барац_біт; 2) абмес_ці; 3) з глыбін_; 4) кал_ян; 5) здранц_велы.
**А5** Адзначце правільна напісаныя словы (формы слоў):
1) адзене; 2) адлюстраванны; 3) ассацыяцыя; 4) бяззю; 5) конніца.
**А6** Адзначце правільна напісаныя словы:
1) гладкі; 2) арэсскі; 3) бесардэчна; 4) ваявоцкі; 5) абкрываешся.
**А7** Адзначце рады аднакаранёвых (роднасных) слоў:
1) дом, дамы, дамамі; 2) праўда, праўдзівы, апраўдаць; 3) вазок, перавозка, ваза; 4) сінь, сіні, сініць; 5) мучны, мука, мучыцца.
**А8** Адзначце словы, якія трэба пісаць праз злучок:
1) (адна) томнік; 2) (аграном) практык; 3) (вет) лячэбніца; 4) (дом) музей; 5) (кіна) стужка.
**А9** Адзначце словазлучэнні з адноснымі прыметнікамі:
1) жалезная ручка; 2) камандзірскі пакой; 3) леснікова дачка; 4) салодкі яблык; 5) парадкавы лічэбнік.
**А10** Адзначце словы, якія трэба пісаць праз злучок:
1) (круга) падобны; 2) (ружова) твары; 3) (калійна) фосфарны;
4) (лілова) пурпуровы; 5) (унтэр) афіцэрскі.
**А11** Адзначце сказы, у якіх ёсць дзеепрыслоўі незакончанага трывання:
1) Восенню, калі над вёскай праляталі птахі, дзяўчынка доўга стаяла на высокім беразе, праводзячы вачамі чараду журавоў.
2) Гаспадыня, заставіўшы стол ядою, выйшла ў суседні пакой.
3) Дасягнуўшы вышэйшых навуковых ступеняў, Скарына прысвяціў лепшы час свайго жыцця асвеце сваіх землякоў.
4) Нават і зараз, нягледзячы на свае восемдзесят год, дзед Мікіта за пояс маладога заткне.
5) Высіцца бераг, то стромка падаючы да ракі, то паката сходзячы да яе прыступкамі, невялікімі выемкамі або глыбокімі ўпадзінамі, зарослымі травой і хмызняком.
**А12** Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга ці будучага простага часу маюць канчатак *-еш (-эш):*
1) адзець; 2) аб'явіць; 3) бараніць; 4) віць; 5) замяніць.

**А13** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць праз злучок:
1) Азёры блішчаць на сонцы раскіданымі *(там) сям* люстрамі.
2) *(Між) волі* згадваецца ранішні расяны луг.
3) Над ракою *(па) ранейшаму* дыміўся цёплы туман.
4) Па адной са сцяжынак хлопцы ішлі доўга, ішлі і амаль не спадзяваліся, што *(калі) небудзь* ёй будзе канец.
5) Палюе гарнастай больш за ўсё *(у) начы.*
**А14** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з *не (ня)* напісаны правільна:
1) *Не старэюць* душой ветэраны.
2) *Не звычайна* і святочна на душы ад гэтай вялікай вады.
3) *Некалі* шлях у напрамку да Старой Рудні ішоў праз лес.
4) *Немагчыма* такому прысніцца.
5) *Нядужы* дзядок сядзеў на прызбе.
**А15** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў ужываецца *ні:*
1) Хіба я сам _ адчуваў радасць жыцця?
2) Як _ дзіўна, але пасля таго брыгаднага сходу маці стала хваліць Загурскага.
3) Хто людзям _ верыць, той і сабе веры _ дасць.
4) Я _ мог _ згадзіцца з ёю.
5) _хто _дзе не здолее запляміць глыбокі след равеснікаў маіх, пра іх _ колі не сатрэцца памяць.
**А16** Адзначце іменныя словазлучэнні:
1) снежная зіма; 2) рота салдат; 3) сказаць сябру; 4) поўныя хараства;
5) напісаць бацьку.
**А17** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы – дзейнікі:
1) Журавы зацягвалі сваю шчымліва-развітальную песню.
2) Нэля з Толем выйшлі з атрада яшчэ прыцемкам.
3) Старыя і малыя павыходзілі з кватэр на ласкавае сонца.
4) Бабуля, раскажы мне казку.
5) Гэта бадзёрыла маладога паэта і надавала яшчэ больш жадання пісаць.
**А18** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў абавязкова ставіцца працяжнік:
1) Ён _ геніяльны паэт.
2) Адзінаццаць-дванаццаць гадоў _ самы ўзрост, каб зразумець, што ў жыцці не апошняе месца займаюць грошы.
3) Паветра _ густое, парнае.
4) Абодва _ гарадскія жыхары.
5) Прывязанасць жывых істот да родных мясцін _ ёсць усеагульная заканамернасць.
**А19** Адзначце аднасастаўны сказ:
1) На траве пры дарозе хлопчык.
2) Бліскучае неба з мірыядамі зорак холадна асвятляла зямлю.
3) Вырашыў я, Сяргей, застацца ў сваім калгасе.
4) На палетках багата ледавіковых валуноў.
5) Летняе неба ў дымнай смузе.
**А20** Адзначце правільныя сцверджанні:
1) Літара *ё* пішацца ў складаных словах з першай часткай *радыё-* незалежна ад націску.
2) Пунктуацыя – сукупнасць правіл ужывання знакаў прыпынку на пісьме.
3) У беларускай мове зваротных дзеепрыслоўяў няма.
4) Ненаціскное *э* заўсёды захоўваецца ў словах іншамоўнага паходжання.
5) Свісцячыя зычныя перад шыпячымі вымаўляюцца як шыпячыя.